ЛЕЙРЭ САЛАБЭР'Я

# Калекцыянерка



*Пераклала з французскай Алена Пятровіч*

ПАПУРЫ
Мінск

Кожны вечар Маргарыта чытала ўголас кнігу. Яна чытала раслінам, кату і самой сабе. Не ведаю, ці слухалі расліны, але выглядалі яны шчаслівымі. Кот дык дакладна не слухаў — ён заўсёды засынаў у самым пачатку. А я, добра схаваўшыся, каб ён мяне не заўважыў (бо, як і ўсе каты, ён любіў паляваць на мышэй), уважліва прыслухоўвалася да кожнага слова...

Ой, я ж забыла прадставіцца! Я мышка Фіфі, збіральніца гісторый для гэтай кнігі. І я жыву вунь там, у тым кашпо наверсе, у доме Маргарыты. Знайшлі мяне? Гэта нялёгка, але калі прыгледзіцеся, то ўбачыце, што я хаваюся на старонках гэтай кнігі, нават там, дзе вы мяне адразу не заўважылі. І кот, дарэчы, таксама! Так што шукайце як мае быць!







Я не заўсёды жыла тут. Аднойчы, шукаючы сабе нешта на зуб, я забрыла ў гэты ціхамірны дом. І знайшла тут шмат ежы, ката, з якім можна гуляць у хованкі, і бабулю, якая штовечар расказвае гісторыі. Мне гэта ўсё так спадабалася, што я надумала тут пасяліцца.

Неяк вясною, паслухаўшы аповед Маргарыты, я пайшла паглядзець на лес. Каты — істоты цікаўныя, але мышы яшчэ цікаўнейшыя.

Раптам нешта мяне асляпіла. Я паглыбілася ў падлесак і ўбачыла яго — стары парэпаны шарык. Я сціснула яго ў руцэ і, як у кнігах Маргарыты, пачала ўяўляць сабе гісторыю, якая змяшчаецца ў гэтым шкляным шарыку.





У мяне не было выбару: я павінна была знайсці новы дом
для сваіх калекцый і гісторый.